# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАТЫЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ ЯК АДЗІН З ФАКТАРАЎ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ І ЭФЕКТЫЎНАСЦІ АДУКАЦЫІ

А. М. БЛІНОВА

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» філіял «Мінскі радыётэхнічны каледж»*

**Анатацыя:** У дадзеным артыкуле разглядаецца выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій на занятках па беларускай мове і літаратуры. Выкарыстанне дадзеных тэхналогій дазваляе палепшыць узровень і якасць ведаў навучэнцаў.

Адной з самых актуальных праблем сучаснай методыкі выкладання філалагічных дысцыплін з’яўляецца выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. На нашу думку, прымяненне інфармацыйных тэхналогій з’яўляецца неабходным на занятках па беларускай мове і літаратуры, так як яны садзейнічаюць якаснаму авалодванню практычнымі навыкамі і ўменнямі, дазваляюць эфектыўна арганізаваць самастойную працу, павышаюць цікавасць да дысцыплін, актывізуюць дзейнасць навучэнцаў, робяць заняткі больш сучаснымі.

З гэтай мэтай у працэсе навучання выкарыстоўваюцца розныя інтэрнэт-рэсурсы: тэкставыя працэсары, электроныя табліцы, электронныя даведнікі, энцыклапедыі, праграмы для падрыхтоўкі прэзентацый і гэтак далей. Увядзенне новых інфармацыйных тэхналогій у навучальны працэс дазваляе актывізаваць сам працэс навучання, зрабіць яго больш яскравым, захапляючым, эфектыўным, а таксама павялічыць аб’ём індывідуальнай работы навучэнцаў.

На занятках па беларускай мове і літаратуры ўдала спалучаюцца сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, заснаваныя на выкарыстанні сродкаў інфармацыйна-камунікатыўнай тэхналогіі, з традыцыйнымі формамі і метадамі, што дазваляе пашырыць інфармацыйна-адукацыйную прастору навучэнцаў, ствараючы тым самым умовы для павышэння іх інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу.

Выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій на занятках па беларускай мове і літаратуры стварае ўмовы для арганізацыі і ўвядзення разнастайнай формы работы і дзейнасці навучэнцаў, актывізуе іх увагу, павышае творчы патэнцыял асобы. Пабудова схем, табліц, стварэнне прэзентацый дазваляе сэканоміць час і больш эстэтычна аформіць матэрыял. Выкарыстанне крыжаванак, пазлаў, ілюстрацый, малюнкаў, розных займальных заданняў, тэстаў, відэа- і аўдыёфрагментаў, стварэнне завочных экскурсій падтрымліваюць цікавасць да заняткаў, робяць іх запамінальнымі.

Часцей за ўсё на занятках выкарыстоўваюцца прэзентацыі. Іх можна ўводзіць і пры тлумачэнні новага матэрыялу, і пры замацаванні ведаў, і пры

выкананні творчых заданняў і фізхвілінак. Прэзентацыя дазваляе змясціць у ёй і падаць па-рознаму інфармацыю для запамінання: праз малюнкі, схемы, тэсты, відэа. Яе можа рыхтаваць і выкарыстоўваць на занятках як выкладчык, так і навучэнец. Гэта ўніверсальная магчымасць спалучыць розныя віды інфармацыі, з аднаго боку, і развіць навыкі працы з праграмай, з другога.

На арганізацыйным этапе заняткаў для стварэння станоўчага і творчага настрою навучэнцаў, а таксама пры тлумачэнні новага матэрыялу выкарыстоўваюцца фрагменты аўдыё-, відэа- і творчых матэрыялаў, а таксама ілюстрацыі: яны наглядна дэманструюць вучэбны матэрыял, дазваляюць задзейнічаць розныя каналы ўспрымання інфармацыі, садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню тэмы. Гэтую візуалізацыю можна выкарыстоўваць і для арганізацыі творчай працы. Напрыклад, пры вывучэнні на занятках па беларускай літаратуры рамана І. Мележа “Людзі на балоце” выкладчык прапануе навучэнцам скласці характарыстыку героя твора на аснове ілюстрацыі або прагледжанага імі відэафрагмента.

На этапе прверкі хатняга задання з выкарыстаннем тэкставых працэсараў і адмысловых праграм актыўна ўводзяцца такія формы кантролю, як складанне тэматычных тэстаў, крыжаванак, рэбусаў, сінквейнаў створаныя самімі навучэнцамі. Гэта дазваляе ўтрымаць іх увагу і павысіць цікавасць да вывучаемай тэмы і дысцыпліны, так як для складання такіх заданняў дазваляецца карыстацца гаджэтамі, што аўтаматычна ўключае іх у навучальны працэс.

На этапах абагульнення і паўтарэння мэтанакіравана выкарыстоўваць электронныя тэсты з самаправеркай, рознаўзроўневыя заданні, кластары і прэзентацыі. Гэта дазваляе павялічыць узровень самастойнай працы навучэнцаў і індывідуалізаваць працэс навучання.

Падводзячы вынік, трэба адзначыць, што інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах заняткаў. Яны з’яўляюцца дадатковым інструментам, выкарыстоўваючы які можна зрабіць працэс навучання больш эфектыўным. А правільна падабраныя інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі напаўняюць працэс навучання сучаснымі метадамі і прыёмамі, што садзейнічае якаснаму засваенню матэрыялу навучэнцамі.

Напрыканцы трэба адзначыць, што інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі актуальна выкарыстоўваць для перадачы інфармацыі і ўзаемадзеяння педагога і навучэнца ў сучаснай адукацыі.

**Спіс літаратуры:**

1. Віслабокава, Н.С. Урок беларускай мовы на сучасным этапе / Н.С. Віслабокава // Беларуская мова і літаратура. – 2012. – № 12.

2. Жуковіч, М.М. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры / М.М. Жуковіч. – Мінск, 2007.

3. Захарова, И.Г. Информационные технологии в образовании / И.Г. Захарова. – М. : Академия, 2018.